След на зямлі

# ТАТАЎ САД ПА-РАНЕЙШАМУ ЦВІЦЕ І РАДУЕ ЛЮДЗЕЙ СВАІМІ ПЛАДАМІ

**Гэта гісторыя пачалася ў далёкім 1946-м, калі сустрэліся і пажаніліся мае бацькі. Абодва яны — Рыгор і Клаўдзія — родам з вёсачкі Рудня, аднак знаёмыя не былі: тата, як многія, пасля за сямігодкі паехаў на вучобу ды заробкі ў далёкі Краматорск мама ў той час была яшчэ дзіцем.**

...Фашысты спалілі нашу вёску ў 1943-м на Узвіжанне, за дзень да вызвалення, ды яшчэ і прасачылі, каб згарэла датла. Наперадзе была зіма. Вяскоўцы туліліся ў зямлянках. Многія, у тым ліку дзве малодшыя сястры майго таты, захварэлі і памерлі.

Будавацца пачыналі толькі вясною — хто як і хто з чаго, бо што маглі старыя, дзеці ды жанчыны? Мужчыны — хоць да некага — прыйшлі на дапамогу пазней, пасля Перамогі.

Мой будучы тата, старшы сяржант Рыгор Зольнікаў, вяртаўся дамоў у красавіку 1946-га. Мама, блакітнавокая прыгажуня, ішла да крыніцы па ваду — яму насустрач. Павіталіся, пазнаёміліся. Потым казалі, што сэрцы ёкнулі адразу, але размовы ды спатканні пачаліся пазней. Спачатку трэ было будавацца, шукаць работу ў райцэнтры: бог абодвух шчодра надзяліў і розумам, і талентам. Калі б не вайна, далёка пайшлі б...

Тата стаў працаваць у райвыканкаме, мама — у райсабесе. Разам пехатою хадзілі дамоў. Так нарадзілася каханне, а з ім — і сям'я.

Праз год з'явілася першая дачушка Людачка.

Месца ў свякроўчынай хаце як быццам хапала, але ж характар у гаспадыні быў вельмі наравісты. Мама, як потым казала, цярпела і зносіла ўсё — нікому не скардзілася. Але яе тата, мой дзядуля Сямён, паціху-памалу стаў нешта будаваць. Вяскоўцы думалі, лазеньку (памерам тры на тры), з двума аконцамі. А калі справа дайшла да фінішу, стала ясна, што гэта... хацінка, асобнае жыллё — ну зусім нечаканы падарунак для маладой сям'і!

Потым да яго прыбудавалі маленькія сенцы, хлеў для жывёлы, выкапалі склеп. Тата адразу ж пасадзіў сад. Ён і сёння цвіце ды радуе людзей сваімі пладамі.

А ў той маленькай хаціне нарадзіліся яшчэ трое дзетак. Як цяпер бачу: самаробныя ложкі стаяць паабапал сцен, і я ў свае тры з паловай скачу з аднаго на другі праз усю нашу хатку.

Ці было там цесна? Далібог, не помню. Помню, што было... радасна. Мама выразала з газет прыгожыя «фіранкі», часта бяліла сцены і столь, а на печы малявала кветкі.

Дарэчы, там жа, у сваёй хацінцы, мы паставілі першую ў вёсцы ёлку, якую ўпрыгожвалі самаробнымі цацкамі (крамнай была хіба адна залацістая шышка, якую тата прывёз з Эстоніі).

Вясной мы хадзілі з мамай на грэблю слухаць канцэрты жаб. А ў грыбы і на рыбалку — гэта ўжо з татам. Начавалі ў шалашы каля возера, спявалі ваенныя песні.

У 1959-м сталі будаваць больш прасторны дом, як па мне — дык сапраўдны палац, так званую пяцісценку! Саша, малодшы з дзяцей, нарадзіўся ўжо там.

Бацькам, ну вядома ж, цяжка было працаваць, будавацца, гадаваць пяцёра дзяцей, але ў хаце ніколі не было сварак. Мы старанна вучыліся, змаглі атрымаць добрую адукацыю і работу па абраных прафесіях, часта пісалі бацькам, пры першай магчымасці, як на крылах, ляцелі дамоў.

...Калі я была ў пятым класе, у мамы пачаліся праблемы з сэрцам. Хуткую дапамогу з райцэнтра чакаць было доўга і страшна, але ж пакінуць родную хату бацькі не рашаліся. Толькі летам 1979-га яны перабраліся ў Клімавічы. Я тады была студэнткай геафака, вярнулася з вытворчай практыкі і ўбачыла на дзвярах замок. Суседзі пацвердзілі мае здагадкі, назвалі новы адрас бацькоў, а галоўнае — далі ключ ад хаты.




З хваляваннем пераступіла родны парог, пакратала рукамі знаёмыя рэчы, перабрала ў думках пражытыя гады, потым пайшла ў сад-агарод.

Грады зелянелі, яблыні, грушы, слівы згіналіся пад цяжарам пладоў. Усё пасмакавала і ўсяго назбірала з сабой, гадзіны праз дзве знайшла патрэбны адрас. Радасць ад сустрэчы не мела межаў! Ды і хата мне спадабалася: амаль цэнтр горада, зялёная вуліца...

Там дажывалі свой век бацькі. А ў Рудню мы наязджалі, каб назбіраць грыбоў і ягад, налавіць ды насушыць рыбы, садзілі гарод. Толькі 20 гадоў таму татаў зруб сястра перавезла пад Мінск на дачны ўчастак. У вёсцы засталася толькі печ, а потым і яе разабралі на цэглу.

...Я даўно не была на малой радзіме, бо далёка і не маю здароўя. Але ж туды наязджаюць родзічы, якія жывуць бліжэй. Яны і расказваюць, што татаў сад жыве, цвіце, таполя і бярозы, якія саджалі старэйшыя сёстры, па-ранейшаму растуць. А нядаўна ў вёску, на радзіму дзядоў, прыязджаў пляменнік з сынам: усё абышлі, напіліся вады з калодзежа, пастаялі на падмурку... Даслалі шмат фота і відэа. Эмоцый — не перадаць! Хіба што ў вершах:

*Мясцінкі мілыя — век не забуду я.*
*Перад нябёсамі за вас малюсь:*
*За вёску родную, што звалі Рудняю,*
*За хату бацькаву, за Беларусь!*

**Наталля Сівак (Зольнікава),**
*Чэрвеньскі раён.*

Весткі з месцаў

# «Прывітальная» — для імяннікаў!

**Юбілейнай праграмай «Залатыя струны творчасці» адзначыў сваё 60-годдзе адзін з самых аўтарытэтных і любімых калектываў Смаргоншчыны — народны ансамбль песні і танца імя М. К. Агінскага. Ён, створаны ў 1964-м на базе харавога і танцавальнага калектыву, з неймавернымі абаротамі набіраў папулярнасць, рос (у ім прымалі ўдзел больш чым сто чалавек — людзі розных узростаў і прафесій), стаўшы знакамітым як на Радзіме, так і за мяжой.**

Не дзіва, што святочная канцэртная праграма ансамбля сабрала ў раённым цэнтры культуры і верных прыхільнікаў, і былых удзельнікаў, і людзей пажылых, якія разам з песнямі хацелі ўспомніць сваю маладосць, і тых самых маладых...

На працягу ўсяго мерапрыемства ў глядзельнай зале панавала ўтульная, можна сказаць, хатняя атмасфера. У выкананні імянніка пад жывую музыку прагучалі кампазіцыі «Прывітальная», «Ясная зара», знакаміты «Паланэз», новыя аўтарскія песні і, вядома ж, найшчырэйшыя віншаванні і найлепшыя пажаданні найперш кіраўнікам ансамбля — Тамары Іванаўне Валчанковай і Аляксандру Палікарповічу Ляху, якія, дарэчы, кіруе яшчэ і вакальным ансамблем у сталічным тэхналагічным універсітэце.

Адзін з удзельнікаў гэтага калектыву Мікалай Цытавец прыехаў у Смаргонь, каб разам адсвяткаваць такую шматзначную дату, падзівіцца ўзнагародам і выканаць новую кампазіцыю «Жыві і квітней, родная Беларусь».

**Анастасія Зайчук,**
*г. Смаргонь.*

Ёсць пытанне

# Што рабіць з пераросплым альвасам?

**У нас дома некалькі старых вазонаў з альвасам (алоэ). Выкінуць іх шкада, бо гэтай раслінай наша бабуля, як расказвалі, лячыла свой цукровы дыябет, матуля — насмарк і раны... Буду ўдзячная, калі падкажаце, як з дапамогай соку ўмацаваць імунітэт і пазбавіцца ад перхаці.**

**Таццяна Маркаўна,**
*Мінскі раён.*

— З альвасу (алоэ) і сапраўды можна прыгатаваць цудоўныя сродкі для надання прыгажосці скуры і валасам, — пагадзілася **біёлаг, аўтар курса па стварэнні фітакасметыкі сваімі рукамі Вольга БУКАТ.** — Але перш-наперш расліну трэба паліць.

Праз два тыдні пасля гэтага, калі адбудуцца патрэбныя працэсы накаплення, зразаем самыя буйныя (не менш чым трохгадовыя) ніжнія лісты, абмываем, на некалькі гадзін уніз чаранкамі ставім у шклянку з вадой, каб выдаліць пякучае рэчыва алаін. Затым загортваем у паперу і на два тыдні кладзём у халадзільнік. Пасля гэтага я рэкамендую лісце заліць невялікай колькасцю вады і прабіць блэндарам. Атрымаецца прыгожая ізумрудная вадкасць з мякаццю. Яе можна прафільтраваць праз адзін-два слаі марлі ці дробнае сіта. Сок, які атрымаецца, я люблю замарозіць у кубікі лёду ці дадаць кансервант, каб даўжэй захоўваўся ў халадзільніку, і потым рыхтаваць маскі для твару ды валасоў.

Калі непакоіць перхаць і сверб скуры на галаве, добра спрацуе маска. Для яе прыгатавання спатрэбіцца 2 ст. л. алею (аліўкавага, какосавага, касторавага, з лопуху), 2 ст. л. соку алоэ, 1 ч. л. вадкага мёду (загусцелы можна разагрэць на вадзяной лазні). Усе інгрэдыенты добра перамешваюцца, наносяцца на скуру галавы і трымаюцца пад шапачкай для душа і ручніком 1-3 гадзіны, пасля чаго змываюцца шампунем. Тады валасы робяцца бліскучымі, дагледжанымі — нават з першага прымянення.

Рэцэпт маскі для твару: 1 ст. л. лыжка смятаны, 1 ст. л. соку/гелю алоэ, 1 ч. л. мёду, 1 ч. л. адвару рамонку ці зялёнага чаю. Зноў жа ўсе інгрэдыенты змешваюцца, трымаюцца на скуры 7-10 хвілін (калі адчуваеце, што маска пачала высыхаць, наносьце наступны слой) і змываюцца цёплай вадой.

Акрамя таго, сок алоэ сапраўды вельмі карысна прымаць унутр. Ён валодае антыдыябетычным ды супрацьзапаленчым эфектамі і ў той жа час, як і алей абляпіхі, стымулюе клетачнае дзяленне, таму ў яго прыёме ўнутр абавязкова трэба рабіць перапынкі на адзін-два месяцы.

Перад тым як піць, атрыманы сок алоэ трэба нагрэць (не вышэй за 50 градусаў!) — хвілін 20 патрымаць на вадзяной лазні. Пад уздзеяннем тэмпературы вадкасць набудзе цёмна-карычневы колер. Яе мы будзем захоўваць у халадзільніку. Ужываць трэба наступным чынам: 1 ст. лыжку соку разбаўляць у 100 мл вады, дадаваць штосьці кіслае, бо чысты сок алоэ вельмі горкі. Менавіта таму раней яго прымалі з мёдам, кагорам, спіртавымі настойкамі, але я не рэкамендую гэта рабіць... Лепш выцісніце сок з лімона, апельсіна, грэйпфрута альбо дадаць перакіслага бярозавіку ці чайную лыжку яблычнага воцату.

Кіслата ліквідуе горыч, і сок становіцца не толькі карысным, але і дастаткова смачным. Гэту гаючую вадкасць выпіваем на працягу дня — перад сняданкам, абедам і вячэрай, альбо, калі ёсць праблемы са страўнікам, падчас ежы. І яшчэ: соку алоэ не трэба гатаваць шмат, дастаткова 200 мл, бо ў халадзільніку без кансервантаў ён можа захоўвацца ўсяго некалькі тыдняў.

На аснове соку алоэ вера можна зрабіць таксама і ўвільгатняльны гель. Для гэтага ў аптэцы ці ў крамах, дзе прадаюцца інгрэдыенты для стварэння натуральнай касметыкі, можна купіць натуральны загушчальнік — гуаравую ці ксантанавую камедзь, гліцэрыну — рэчыва, у якім мы будзем яго размешваць, а таксама кансервант.

Каб прыгатаваць 100 мл гелю алоэ вера, бяром 50 мл вады і дадаём туды пяць кропель кансерванту, каб гель захоўваўся год, размешваем стэрыльным венчыкам (загадзя апрацаваным спіртам ці патрыманым у кіпні). У другой шклянцы раствараем 1 грам камедзі ў 5 мл гліцэрыны. Слізь, якая ўтварылася, дадаём да нашай вады з кансервантам і хутка перамешваем. У выніку яна загусцее — атрымаецца прыемная цягучая кансістэнцыя, да якой дадаём сок алоэ (50 мл). Пры жаданні — эфірныя алеі ды 2-3 кроплі вітаміну Е. Добра ўзбіваем венчыкам ці капучынатарам і пераліваем у стэрыльны флакон з цёмнага шкла для захоўвання (абавязкова падпісваем дату прыгатавання).

Гель можна наносіць на твар, валасы, ён з'яўляецца цудоўнай асновай для стварэння натуральнай касметыкі — крэмаў, ласьёнаў, тонікаў.

**Запісала Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**